**БЕЛАРУСКІ ПРАФЕСІЙНЫ САЮЗ**
**РАБОТНІКАЎ АДУКАЦЫІ І НАВУКІ**

**праспект Пераможцаў, 21, каб. 1307**
**220126, г.Мінск, тэл/факс 203-81-34**
**e-mail: wr@estu.by**
**р/р 301574 1203012 у аддзяленні №539**
**ААТ «Белінвестбанк» г. Мінска (код 739),**
**УНН 100060327, АКПА 02679256**

**БЕЛОРУССКИЙ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЙ СОЮЗ**
**РАБОТНИКОВ ОБРАЗОВАНИЯ И НАУКИ**

**проспект Победителей, 21, каб. 1307,**
**220126, г.Минск, тел/факс 203-81-34**
**e-mail: wr@estu.by**
**р/с 3015741203012 в отделении №539**
**ОАО «Белинвестбанк» г. Минска (код 739),**
**УНН 100060327, ОКПО 02679256**

30.12.2013 № 01-14/583

Міністру адукацыі Рэспублікі Беларусь
Маскевічу С.А.

Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 22.08.2012 №101

Шаноўны Сяргей Аляксандравіч!

Цэнтральны камітэт Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі разгледзеў накіраваны ў рабочым парадку праект пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ”Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2012 г. №101“ (далей – пастанова). У цэлым ранейшыя прапановы ЦК галіновага прафсаюза ўлічаны дадзеным праектам. Разам з тым прапануем унесці ў Інструкцыю аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі (акрамя педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу), зацверджаную пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2012 г. №101, наступныя змяненні і дапаўненні ці выкласці адпаведныя змяненні і дапаўненні наступным чынам:

1. Пункт 17 дапоўніць часткай другой наступнага зместу:

”Працэдура атэстацыі на прысваенне (пацвярджэнне) другой, першай кваліфікацыйнай катэгорыі не павінна перавышаць трох месяцаў з дня падачы педагагічным работнікам заявы ў атэстацыйную камісію.

Працэдура атэстацыі на прысваенне (пацвярджэнне) вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі і кваліфікацыйнай катэгорыі ”настаўнік-метадыст“ не павінна перавышаць трох месяцаў з дня прадастаўлення дакумента аб здачы кваліфікацыйнага экзамену.

Па жаданні педагагічнага работніка ў тэрміны, указаныя ў частках першай, другой дадзенага пункта, не ўлічваецца тэрмін часовай непрацаздольнасці.“.

2. Пункт 18 дапоўніць часткамі трэцяй і чацвёртай наступнага зместу:

”Дапускаецца атэстацыя педагагічных работнікаў на прысваенне другой і першай кваліфікацыйных катэгорый па пасадзе ”выхавальнік дашкольнай адукацыі“ пры наяўнасці вышэйшай (сярэдняй

спецыяльнай) адукацыі па профілях адукацыі ”Педагогіка“, ”Педагогіка. Прафесіянальная адукацыя“.

Дапускаецца атэстацыя педагагічных работнікаў на прысваенне другой і першай кваліфікацыйных катэгорый па пасадзе ”настаўнік“ пры наяўнасці вышэйшай адукацыі па профілі адукацыі ”Прыродазнаўчыя навукі“.

3. Пункт 19 пасля часткі трэцяй дапоўніць часткай наступнага зместу:

”Асобы, якія прыняты на пасады педагагічных работнікаў з пасад прафесарска-выкладчыцкага складу, навуковых работнікаў і маюць стаж працы на гэтых пасадах не менш, чым два гады, дапускаюцца да атэстацыі на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі па займаемай пасадзе без уліку стажу працы па гэтай пасадзе. Асобы, якія прыняты на пасады педагагічных работнікаў з пасад прафесарска-выкладчыцкага складу, навуковых работнікаў і маюць стаж працы на гэтых пасадах не менш, чым пяць гадоў, дапускаюцца да атэстацыі на прысваенне першай кваліфікацыйнай катэгорыі па займаемай пасадзе без уліку стажу працы па гэтай пасадзе.“.

4. Частку першую пункта 20 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

”Наступным педагагічным работнікам пры праходжанні атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі на адпаведнай пасадзе педагагічнага работніка без прад’яўлення патрабаванняў да наяўнасці стажу працы на гэтай пасадзе можа быць прысвоена тая ж кваліфікацыйная катэгорыя, якая ім была прысвоена раней па іншай пасадзе педагагічнага работніка:

настаўнікі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах выкладчыка, метадыста, настаўніка-дэфектолага, майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі;

выкладчыкі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, метадыста, настаўніка-дэфектолага, майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі;

метадысты, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, майстра вытворчага навучання, выхавальніка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, настаўніка-дэфектолага, педагога сацыяльнага, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара, педагога дадатковай адукацыі;

майстры вытворчага навучання ўстановы адукацыі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка;

настаўнікі-дэфектолагі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, метадыста;

педагогі-арганізатары, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, метадыста, выхавальніка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, педагога-псіхолага, педагога сацыяльнага, культарганізатара, педагога дадатковай адукацыі;

педагогі сацыяльныя, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, метадыста, выхавальніка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара, культарганізатара, педагога дадатковай адукацыі;

педагогі-псіхолагі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, метадыста, выхавальніка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, педагога сацыяльнага, педагога-арганізатара, культарганізатара, педагога дадатковай адукацыі;

выхавальнікі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, метадыста, майстра вытворчага навучання, настаўніка-дэфектолага, выхавальніка дашкольнай адукацыі, педагога-псіхолага, педагога сацыяльнага, педагога-арганізатара, культарганізатара, педагога дадатковай адукацыі;

выхавальнікі-метадысты, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, настаўніка-дэфектолага, выхавальніка дашкольнай адукацыі, педагога сацыяльнага, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара, педагога дадатковай адукацыі;

выхавальнікі дашкольнай адукацыі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, настаўніка-дэфектолага, выхавальніка, выхавальніка-метадыста, метадыста, педагога сацыяльнага, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара;

акампаніятары, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, культараганізатара, педагога дадатковай адукацыі, музычнага кіраўніка;

музычныя кіраўнікі, калі яны пераведзены з пасад настаўніка ці выкладчыка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, акампаніятара, культараганізатара, педагога дадатковай адукацыі;

педагогі дадатковай адукацыі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка ці выкладчыка, выхавальніка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, музычнага кіраўніка, кіраўніка фізічнага выхавання, майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі, культарганізатара, метадыста, акампаніятара, педагога-арганізатара;

кіраўнікі фізічнага выхавання, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка ці выкладчыка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, педагога дадатковай адукацыі, педагога-арганізатара.

Пры праходжанні атэстацыі ў выпадках, прадугледжаных часткай першай дадзенага пункта, педагагічныя работнікі, якія прэтэндуюць на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, вызваляюцца ад здачы кваліфікацыйнага экзамену.“.

5. Пункт 21 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

”Кіраўнікі арганізацый сістэмы адукацыі (іх намеснікі), якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць у частцы рэалізацыі зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання, маюць права праходзіць атэстацыю на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі па адпаведных пасадах педагагічных работнікаў ва ўстаноўленым дадзенай Інструкцыяй парадку.“.

6. У пункце 30:

6.1. пасля слова ”Ад“ выключыць слова ”абавязковай“;

6.2. пасля слова ”вышэйшай“ дапоўніць словам ”кваліфікацыйнай“;

6.3. пасля слова ”катэгорыі“ дапоўніць словамі ”, пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, кваліфікацыйнай катэгорыі ”настаўнік-метадыст“.“

7. Падпункт30.4 пункта 30 пасля слоў ”педагагічных работнікаў“ дапоўніць словамі ”і іншых рэспубліканскіх конкурсаў у адпаведнасці з дадаткам;“ (у дадатку неабходна прадугледзець назвы ўсіх адпаведных конкурсаў, у тым ліку тых, якія не маюць і (ці) да пэўнага часу не мелі статусу рэспубліканскіх конкурсаў прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў).

Старшыня Цэнтральнага камітэта
галіновага прафсаюза — А.А.Бойка

Дапіра 2038139
13.12.24 МА РБ (Атэстацыя).doc